# § 13. Правілы пабудовы бяззлучнікавых складаных сказаў, знакі прыпынку

§ 0–13

**174.** Сэнсавыя адносіны паміж часткамі ў складаным бяззлучнікавым сказе абумоўліваюць выбар знака прыпынку. Праілюструйце сэнсавыя адносіны паміж часткамі, выпісаўшы з прапанаваных сказаў адпаведныя. Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.

| Знак прыпынку ў складаным бяззлучнікавым сказе | Сэнсавыя адносіны паміж часткамі |
|---|---|
| Коска, кропка з коскай | Пералічэнне, адначасовасць або паслядоўнасць дзеянняў |
| Двукроп'е | Прычына, тлумачэнне, дапаўненне, абагульненне |
| Працяжнік | Супастаўленне, супрацьпастаўленне, вынік, абагульненне, параўнанне |

У з о р  к а м е н т а р ы я: *Над густа-сінім возерам чарот з прыходам восені шуміць тужліва; здаволена гумно на поўны рот глытае дар багатай, спелай нівы* (У. Караткевіч). Складаны бяззлучнікавы сказ, складаецца з дзвюх частак. Першая частка — *Над густа-сінім возерам чарот з прыходам восені шуміць тужліва.* Граматычная аснова — *чарот шуміць*. Другая частка — *здаволена гумно на поўны рот глытае дар багатай, спелай нівы.* Граматычная аснова — *гумно глытае*.

Часткі сказа называюць з'явы, якія адбываюцца адначасова (паміж імі можна ўставіць злучнік *і*). Паміж часткамі ставіцца кропка з коскай, паколькі часткі развітыя, не маюць цеснай сэнсавай сувязі паміж сабой, другая частка мае свой знак прыпынку — коску паміж аднароднымі азначэннямі.

1. Ноч свяціла агнямі і зорамі: нарадзіўся Янка Купала. 2. Ты — мая лясная казка ў красе доўгачаканай, ты — мая святая песня. 3. Месяц заснуў на коміне хаты, кінуў адбіткі на люстра вады; дрэвы густыя ў бліскучых ла́тах, як вартавыя, вартуюць сады. 4. Ноч прыйшла да зямлі на спатканне, захад скончыў агнём палыхаць, дубы ў малочным тумане веліканамі ціха стаяць. 5. Свет вакол чакае святла і цеплыні: чакае дуб скарэлы на пагорку, чакаюць хаты сонечных прамянёў, чакаюць вішні белых пакрывалаў. 6. Зямля гудзе, як цёплы вулей, знікаюць крыўды, боль і зло. 7. Зноў бранзавеюць шышкі на ялінах, зноў восень на бярэзніках ляжыць. 8. У вяршыні самых гонкіх дрэў маланка з неба б'е — у вяршыні маленькіх і ніцых



Правообладатель Национальный институт образования

дрэў маланка ніколі не б’е. 9. Уздыхае ветрык, спадае ліст, асцярожнае сонца з голых асін выпаўзае на ціхі сінічы свіст *(У. Караткевіч)*.

● На аснове сказаў падбярыце матэрыял для арфаграфічнай дыктоўкі на правіла «Правапіс галосных ***е, ё, я***». Дапоўніце выпісаныя словы прыкладамі на захаванне пачатковай літары ***я*** ў корані слоў, на правапіс ***я*** ў паслянаціскных складах.

**175.** Выкарыстаўшы граматычныя асновы сказаў з папярэдняга практыкавання (3-4 на выбар), пабудуйце па тры бяззлучнікавыя сказы, каб у першым выпадку паміж часткамі трэба было паставіць коску, у другім — двукроп’е, у трэцім — працяжнік.

У з о р: *Знікаюць крыўды, боль і зло...*
*Знікаюць крыўды, боль і зло, свет напаўняюць людскасць і дабрыня.*
*Знікаюць крыўды, боль і зло: людзі пачалі прыслухоўвацца адзін да аднаго.*
*Знікаюць крыўды, боль і зло — свет прачнуўся і памаладзеў.*

**176.** Запішыце сказы, выправіўшы сінтаксічныя памылкі, дапушчаныя ў складаных сказах. Растлумачце прычыны парушэнняў сінтаксічных норм.

1. Сёння ідзе не толькі дождж, але і, відаць, будзе навальніца. 2. Газіфікацыю аддаленых[сл] вёсак трэба завяршыць, якая пачалася яшчэ ў 70-я гады мінулага стагоддзя. 3. Гісторыя не толькі ўплывае на літаратуру, але і літаратура ўплывае на гісторыю. 4. Набягалі то невялікія хмаркі, то зноў з’яўлялася сонца. 5. На жаль, часам мы або забываем пра сяброў, або сябры забываюць пра нас. 6. Слова — вялікая сіла, таму што слова можа аб’яднаць людзей і раз’яднаць. 7. Жыццё героя — гэта гісторыя чалавека, моцнага духам і які годна выступае ад імя свайго пакалення. 8. Аб гэтым вы можаце прачытаць у матэрыялах нашага карэспандэнта, які з’явіцца ў суботнім выпуску газеты. 9. Галоўнае, чаго чакалі ад маладога інжынера, — гэта рэканструкцыю прадпрыемства. 10. Вершы прасякнуты шчырай павагай да селяніна, у якіх расказваецца пра цяжкую, але такую неабходную вясковую працу. 11. Гутарковы стыль мае свае асаблівасці, куды адносяцца непаўната выказвання, ужыванне выклічнікаў, варыянтнасць у вымаўленні. 12. Мы спыніліся на Ушаччыне, дзе шмат азёр і вада ў якіх вельмі чыстая *(З вучнёўскіх работ)*.

● Запішыце асабовыя назоўнікі, ужытыя ў сказах. Вызначце іх склон. Растлумачце правапіс канчаткаў.



Правообладатель Национальный институт образования